# Кніжнае вымярэнне

**СУМЕСНЫ ПРАЕКТ «ГРОДЗЕНСКАЙ ПРАЎДЫ» І АБЛАСНОЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ Я. Ф. КАРСКАГА**

Працяг. Пачатак у № 108.

**Бібліятэчная справа Беларусі ў перыяд уваходжання яе зямель у склад Расійскай імперыі (1795–1917) развівалася пад уздзеяннем супярэчлівых тэндэнцый. З аднаго боку, развіццё навукі, культуры, прамысловасці садзейнічала пашырэнню сеткі бібліятэк і павелічэнню іх фондаў. З другога боку, войны, сацыяльныя і палітычныя канфлікты, цэнзурныя і іншыя абмежаванні прыводзілі да закрыцця бібліятэк і спусташэння іх фондаў.**



Знакамітае Жыровіцкае Евангелле сёння захоўваецца ў навуковай бібліятэцы Літвы

## КНІГІ ЗАМЕСТ ДРОЎ

Трагічныя падзеі, звязаныя з вайной 1812 года, закранулі і Гродзеншчыну. Нашы землі сталі арэнай жорсткіх баёў рускіх войск з арміяй Напалеона. Былі разбураны гарады і вёскі, разграблены маёнткі, саборы, манастыры, навучальныя ўстановы і іх бібліятэкі. Салдаты варожых армій кідалі ў печы замест дроў кнігі, калі станавіліся на начлег у грамадскіх памяшканнях.

Пасля заканчэння вайны царскі ўрад прыняў рад мер, накіраваных на падаўленне іншадумства і ўмацаванне расійскай улады ў заходніх губернях. Міністэрствам духоўных спраў і народнай асветы быў устаноўлены строгі надзор за навучальнымі ўстановамі і бібліятэкамі. Вучоны камітэт выдаваў спіскі кніг, якія выключаліся з фондаў бібліятэк.

Рух дзекабрыстаў за скасаванне прыгоннага права і самадзяржаўя часткова закрануў афіцэрскія колы Расійскай арміі, якая была расквартавана на тэрыторыі Беларусі. Тут у розныя гады праходзілі службу дзекабрысты Н.М. Мураўёў, А.А. Бястужаў, В.К. Кюхельбекер і іншыя. Яны стваралі тайныя арганізацыі, у якіх распаўсюджвалася нелегальная літаратура. Так, у 1825 годзе у Літоўскім корпусе, расквартараваным у Гродзенскай губерні, дзейнічала тайнае "Таварыства ваенных сяброў". Яно мела невялікую бібліятэку з забароненай літаратурай.

## У ДАЛЁКІХ ШАФАХ

У першай трэці XIX стагоддзя на заходніх землях Беларусі працягвалі функцыянаваць бібліятэкі розных рэлігійных канфесій – некалькіх мужчынскіх і жаночых праваслаўных манастыроў, грэка-каталіцкіх (уніяцкіх) манастыроў, каталіцкіх кляштароў усіх манаскіх ордэнаў. Фактычна кожны кляштар меў сваю бібліятэку. Але да 30-х гадоў XIX стагоддзя па-ранейшаму найбольшы лік навучальных устаноў і бібліятэк заставаўся ў падпарадкаванні каталіцкага духавенства.

Найбуйнейшай каталіцкай бібліятэкай на Гарадзеншчыне была бібліятэка дамініканскага кляштара ў Гродна. У 1805 годзе яе фонд налічваў 15 тысяч тамоў тэалагічных і свецкіх кніг XVI – пачатку XIX стагоддзя, а таксама рукапісаў. У бібліятэку дамінікан трапіла таксама бібліятэка гродзенскіх езуітаў пасля касацыі ордэна езуітаў, у складзе якой былі славутыя старадрукі караля Жыгімонта Аўгуста. Адкрыццё пры кляштары дамініканаў павятовай школы са ступенню гімназіі, стварэнне механічнага, мінералагічнага і фізічнага кабінетаў абавязвала набываць кнігі па розных галінах ведаў.

Дамініканцы старанна апекаваліся бібліятэкай. Было падабрана адпаведнае памяшканне. Кнігі стаялі ў высокіх шафах, закрытыя тонкімі драцянымі сетачкамі, у належным парадку па стагоддзях, па прадметах і алфавіце. Усе яны мелі карткі-наклейкі з літарамі-шыфрамі лацінскага алфавіта. Калі траплялiся выданні са страчанымі старонкамі, то захавальнікі кнігазбору стараліся аднавіць тэкст, перапісваючы яго ад рукі. Кнігі, занесеныя ў Індэкс забароненых выданняў, звычайна не знішчаліся, а толькі хаваліся ў далёкія шафы. Дзякуючы гэтаму выжылі многія каштоўныя выданні. Бібліятэка гарадзенскіх дамініканаў была даступна і для свецкіх. Наведвальнікаў-чытачоў запісвалі ў асобныя карткі. Не дазвалялася толькі выносіць кнігі за сцены бібліятэкі.

На жаль, бібліятэку чакаў трагічны лёс. У 1833 годзе за ўдзел ксяндзоў і выхаванцаў у лістападаўскім паўстанні 1830–1831 гадоў быў зачынены дамініканскі кляштар. Праз тры гады кнігі з бібліятэкі дамініканаў былі прыняты пад апеку Гродзенскай мужчынскай гімназіі. Яе кнігазбор пачалі дзяліць, адпраўляць у Маскву і Санкт-Пецярбург або знішчаць. На пачатку XX стагоддзя Ю. Ядкоўскаму ледзве ўдалося сабраць у Гродзенскі гістарычны музей 905 тамоў з некалі такой багатай дамініканскай бібліятэкі.

## ШТО ЧЫТАЛІ ПІЯРЫ?

Побач з манастырскімі бібліятэкамі важнымі цэнтрамі бібліятэчнага абслугоўвання граматнага насельніцтва былі бібліятэкі навучальных устаноў.

Дзякуючы падтрымцы вядомага дзеяча ВКЛ Вінцэнта Тышкевіча і на яго сродкі была набыта цудоўная бібліятэка для Гродзенскай губернскай гімназіі ў Свіслачы. Праграма гімназіі была шырокая і разнастайная. Тут вывучаліся матэматычныя навукі, гісторыя, мовы, геаграфія, прыродазнаўчыя навукі, літаратура і маляванне. Таму ў бібліятэцы пераважала вучэбная літаратура. Гімназія мела добрую матэрыяльную базу, і ў 1839 годзе бібліятэка налічвала 3478 тамоў кніг. Па падпісцы атрымлівалі часопісы "Курьер Літэвскі", "Дзённік Віленскі", "Гродзенскія губернскія ведамасці".

Выдатныя кнігазборы мелі школы піяраў. Манахі-піяры былі вельмі адукаванымі людзьмі. Бібліятэка Шчучынскай школы піяраў налічвала ў першай трэці XIX стагоддзя 2751 кнігу. Адукацыйнай камісіяй школа піяраў у Шчучыне была ўключана ў дзяржаўны рэестр у 1796 годзе і абвяўлена публічнай, гэта значыць свецкай школай. Таму і літаратура ў бібліятэцы была прадстаўлена не толькі багаслоўскімі кнігамі, але і свецкімі, навуковымі выданнямі. У 1820 г. Віленскі ўніверсітэт надаў Шчучынскай школе 6-класны статус. Школа мела кваліфікаваны склад выкладчыкаў і знакамітых выпускнікоў, як, напрыклад, Ігнацый Дамейка, заснавальнік Нацыянальнага ўніверсітэта Чылі.

**Людміла ВДАВЕНКА, галоўны бібліятэкар аддзела мастацтва абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага**